Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 18/11/2026 01:04:42

DOI:10.17951/we.2017.3.1.277. | Wschód Europy • Восток Европы • East of Europe vol 3, 1 / 2017

Аляксандар Астравух
Менск, Беларусь

«Мамэ-лошн ун татэ-калошн», альбо Рэстаўрацыя ідышу па-беларуску

Jak jidiš — to pojideš; jak jidiš — to dojideš!
Jak ne jidiš — to ne pojideš; jak ne jidiš — to ne dojideš!
Народная песьня

«Afn barg, unter barg štejen tojbn porn...»
(«На гары, пад гарой галубы стаялі...»)

Забытая богам Усходняя Беларусь, мястэчка Амсьціслаў, лета 1984 году…

…Замкавая гара, Траецкая гара, Дзявочая гара, Панівойская гара… Парэзаны ўзгоркамі пэйзаж з вывернутаю пэрспэктывай…

Удалечыні зьмяіцца рэчка Віхра…

Фрэскі Кармэліцкага й руіны Езуіцкага касьцёлаў…

Чыстыя, ніводнага кусьціка, аб'едзеныя козамі габрэйскія могілкі з каменнымі помнікамі, дзіўны, незразумелы шрыфт, які, чамусьці здавалася, перакулены дагары нагамі…

«Кагальны калодзеж», да якога ледзьве ня ўсё мястэчка прыходзіць па ваду…

Пантамімічныя спэктаклі тэатру глуханямых дзяцей зь мясцовага інтэрнату…

Помнік піянэру са зьвернутаю, але «перабінтаванай» (замазанай гіпсам) шыяй у гарадзкім парку…

Смак салодкіх дзікіх трускалкаў, што растуць у траве па схілах узгоркаў, зьмяшаны з пахам чабору й заквітнелых ліпаў…

Сьпёка распаленага паветру й ратавальная прахалода капліцы Кармэліцкага касьцёлу, у якой мы мусілі працаваць…

Мы — гэта студэнты-дыплёмнікі тэатральна-мастацкага інстытуту Хведар Сарока, Сяргей Дзенісенка, Валянцін Дзялендзік і я, Аляксандар Астравух, запрошаныя на практыку нашым выкладчыкам і кіраўніком творчае майстэрні мастакоў-рэстаўратараў «Бастылія» Алегам Уладзімеравічам Хадыкам.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 18/11/2026 01:04:42

«Ejner fun di same eršte, same štarke ajndrukn
fun der kindhajt – der zavodišer hudok…»
(«Адно з самых першых, самых яскравых
уражаньняў дзяцінства – завадзкі гудок…»)

Два гады таму, у 1982 годзе, памёр Брэжнеў, праз год ня стала Чарненкі, Андропаў жа яшчэ жывы… Гэты час ужо пазьней, пасьля сьмерці Андропава, аматары савецкага чорнага гумару назавуць «пяцігодка ў чатыры труны», але ў 1985 годзе прыйшоў Гарбачоў, і пяцігадовы плян аказаўся сарваны.

Можна падумаць, што Брэжнеў мае хоць нейкае дачыненьне да ідышу, — ні вухам ні рылам… Але ж не, высьвятляецца, мае — і самае што ні ёсьць наўпростае… Мы ідыш вучылі па Брэжневе, як сказаў бы паэт-клясык!

22 красавіка 1979 году генэральны сакратар ЦК КПСС Леанід Брэжнеў атрымаў літаратурную Ленінскую прэмію й быў урачыста прыняты ў Саюз пісьменьнікаў СССР у якасьці «вялікага пісьменьніка зямлі рускае» («ВПЗР»). Раптам, на старасьці гадоў, падводзячы жыцьцёвыя вынікі, правадыр пралетарыяту «апарасіўся» чарадою мэмуарных кніжак: «Жыцьцё па завадзкім гудку», «Пачуцьцё радзімы», «Малая Зямля», «Адраджэньне», «Цаліна», — пад агульным назовам «Успаміны».

Я дакладна магу сказаць, як на ідышы будуць гучаць «Успаміны» — вядома ж, «*Zixrojnes*»!

Вы запытаеце, адкуль я гэта ведаю. І я вам адкажу!

Менавіта кніга «Ўспаміны» была вызначаная як найвышэйшае дасягненьне ВПЗРа, безумоўна, вартае таго, каб быць перакладзенай на ўсе мовы калі ня сьвету, то хаця б шматнацыянальнага (хочацца напісаць «шматпакутнага») Савецкага Саюзу! Дзякуй богу, не забыліся на ідыш і беларускую.

І пераклалі! І ня проста пераклалі! Найлепшыя савецкія перакладчыкі (відаць, разам з найлепшымі савецкімі пісьменьнікамі, што напісалі гэтыя кнігі) стварылі сапраўдныя літаратурныя шэдэўры ў поўнай адпаведнасьці з аўтарскім тэкстам. І гэта без іроніі… Самі народныя артысты СССР М. Ульянаў па радыё й В. Ціханаў па тэлебачаньні штодня агучвалі гэтыя творы для ўсяго савецкага народу.

І вось, нарэшце, у дадатку да адзінага ў СССР часопісу на ідышы «*Sovetiš Hejmland*» («Савецкая Радзіма») у 1982 годзе выйшла кніжыца Леаніда Брэжнева.

Гэтая кніга й сталася сапраўднаю магчымасьцю для вывучэньня ідышу. «Бастыліянцы» (А. Хадыка, У. Ракіцкі, М. Залатуха, Ю. Маліноўскі, С. Верамейчык) ладзілі сынхронныя чытаньні Брэжнева на розных мовах (украінскай, беларускай і ідышы), а якасьць перакладаў дазваляла бязь цяжкасьцяў разумець тэкст на ідышы.

Здарыўся нават вельмі забаўны выпадак. У Амсьціслаў з мэтаю «кантролю за правядзеньнем рэстаўрацыйных працаў» прыехала дзяржаўная камісія. Яе прадстаўнікі засьпелі «*arbeter-mišpoxe*», калі тыя ў рабочы час ляжалі ў позе старажытных рымлянаў, але пры гэтым займаліся калектыўным вывучэньнем

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 18/11/2026 01:04:42

«нятленкі» на ідышы. Рэвізоры былі ў такой ступені гэтым агаломшаныя, што ня толькі не абазначылі рэстаўратарам ніякіх прэтэнзіяў, але і пазьней пра гэты выпадак нікому не распавядалі й самі гэтага ніколі ня ўзгадвалі, відавочна, прыняўшы яву за кашмарны сон.

Я мяркую, што менавіта ў гэты момант і прыйшло ўсьведамленьне «магутнае моцы» мовы ідыш!

«Špant že, xevre, ferd in vogn, mir veln forn jogn…»
(«Запрагайце, хлопцы, коней, мы паедзем даганяць…»)

Мястэчка Амсьціслаў, безумоўна, мусіць называцца новаю сталіцай ідышу. Менавіта тут «бастыліянцы» ў 1981 годзе пазнаёміліся й пасябравалі з Рыўкай Міркінай і Аўромам Ліпкавым, ад якіх пачулі жывы ідыш і занатавалі песьні на гэтай мове. Гэтыя песьні й прыказкі імгненна запаміналіся й разыходзіліся па тэатральна-мастацкім інстытуце. Трэба сказаць, што менавіта гэта сталася галоўнаю падставай для таго, каб нашаму настаўніку Алегу Хадыку, архітэктару, мастацтвазнаўцу й рэстаўратару, канчаткова забаранілі займацца пэдагагічнаю дзейнасьцю, з канфідэнцыйнай фармулёўкай «за распаўсюд сіянізму» (гэта быў час, калі квітнела ідэалёгія У. Бегуна й заўзятыя ідэалягічныя працаўнікі ад культуры ў барацьбе з «сусьветнаю жыдамасонскай змовай» вышуквалі сіянісцкую сымболіку ў мастацкіх творах і дэкаратыўным афармленьні новых гарадзкіх будынкаў).

Беларус Алег Хадыка нарадзіўся ў 1941 годзе ў Менску. Ён вырас на Старажоўцы, сярод габрэяў і ідышу, які тады яшчэ гучаў у беларускай сталіцы. Менавіта ён ініцыяваў вывучэньне ідышу з рэстаўратарамі «Бастыліі» й у асяродку студэнтаў тэатральна-мастацкага інстытуту ў 1980-я гады. І ідыш прыжыўся й расквітнеў. Вобразна гаворачы, сярод каламутнае ідэалягічнае «сівухі» разьвітога сацыялізму «*mame-lošn*» для нас падаваўся глытком чыстае крынічнае вады з амсьціслаўскага «кагальнага калодзежу». У бастыльскім коле ідыш стаў чымсьці накшталт «*a mejvn-lošn*», «*a lošn-sagenoer*» (таемнаю мовай), прафэсійным «жаргонам», каставым адрозьненьнем. У савецкі час ідыш быў нейкім «*a lectn mokem-menuxe*» (апошнім прыстанкам) для беларускай мастацка-рэстаўрацыйнай інтэлігенцыі. І тады, і дасюль кожны, хто трапляе ў рэстаўрацыю (цяпер гэтая майстэрня называецца «Басталія»), — а гэта вельмі шырокае кола маладых людзей, студэнцкае моладзі з розных гарадоў Беларусі (месцаў працы рэстаўратараў) — абавязкова праходзіць школу ідышу і застаецца з гэтаю мовай назаўсёды. Ідыш стаўся рэстаўрацыйнаю прышчэпкай, своеасабліваю «праверкай на вашывасьць».

Менавіта там, у асаблівым асяродку «бастыльскіх» рэстаўратараў, ад амсьціслаўскіх дзікіх трускалкаў й народных песень і прымавак, брэжнеўскіх «*Zixrojnes*» і ўрокаў з «*Sovetiš Hejmland*» нарадзіўся й мой ідыш. Праўда, першае маё знаёмства з гэтаю мовай адбылося на год раней, калі мы з Валікам Дзяленджікам раніцамі ў душы інтэрнату тэатральна-мастацкага інстытуту сьпявалі ам-

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 18/11/2026 01:04:42

сьціслаўскія песьні на ідышы (дзе ж яшчэ было выконваць габрэйскія песьні на той час!): «*Ša, du majn kind, cu got darf men hofn…*» *(«Цішэй, маё дзіцятка, на Бога трэба спадзявацца…»)*. Валік, мой сусед па пакоі ў інтэрнаце, пабываў у Амсьціславе летам 1983 году й ужо «прышчапіўся» на ідыш.

«Az me zuxt, gefint men…»
(«Хто шукае, той знаходзіць…»)

Трэба колькі словаў сказаць пра тагачасныя магчымасьці вывучаць ідыш. Ды што пра іх і казаць! Гаварыць няма пра што — іх амаль не было. Трэба было пайсьці ў «ленінку» (гэтак тады называлася нашая Нацыянальная бібліятэка, якая зараз таксама мае прыгожае найменьне — «чупа-чупс»), замовіць часопісы «*Sovetiš Hejmland*» з кнігасховішча. Я ня ведаю, чаму, але менавіта тая частка кнігасховішча, у якой знаходзіліся гэтыя часопісы, разьмяшчалася дзесьці ў Івянцы. У мяне няма словаў, пры дапамозе якіх можна апісаць той дыялёг, у меншай ступені нават слоўны, хутчэй, дыялёг поглядаў, мігаў, выклічнікаў, што адбываўся паміж бібліятэчным супрацоўнікам і студэнтам, які замаўляў габрэйскія часопісы. Праўда, праз тыдзень часопісы ўсё ж прыяжджалі зь Івянцу. І (во шчасьце!) у кожным зь іх сярод акіяну нікому не зразумелых значкоў была адна староначка па-расейску «У дапамогу тым, хто вывучае ідыш», якую для «чайнікаў» вёў Ш. Сандлер. Гэтая староначка карпатліва перапісвалася ў агульны сшытак, які прызначаўся для лекцыяў па гісторыі выяўленчага мастацтва. Напэўна, вы здагадаліся, чым даводзілася ахвяраваць дзеля вывучэньня ідышу.

У 1980, 1982, 1983, 1985 гадох урокі Ш. Сандлера выходзілі таксама асобнымі сшыткамі ў дадатку да часопісу «*Sovetiš Hejmland*».

Дарэчы, зусім забыўся: для пачатку трэба было хаця б вывучыць альфабэт. Для гэтага ў савецкі час існавалі цэлыя дзьве магчымасьці. У 2-м томе «Сьціслае літаратурнае энцыкляпэдыі» яшчэ ў 1964 годзе быў надрукаваны габрэйскі альфабэт, і (гэта ўжо зусім падарунак!) ён жа — у 10-м томе «Беларускае савецкае энцыкляпэдыі» ў 1974 годзе. Але трэба ж было здагадацца яго там вышукаць. Зараз цяжка ў гэта паверыць, але час быў такі, што страшна было нават выявіць штосьці падобнае ў савецкай кнізе!

Гісторыя складаньня слоўніку пачалася ў 1979 годзе, калі Алег Хадыка ўсё ж адшукаў габрэйскі альфабэт у названай «Сьціслай літаратурнай энцыкляпэдыі», што й дазволіла яму прачытаць першую ягоную кніжку на ідышы «*Di ferte strune*» *(«Чацьвертая струна»)* Шыке Дрыза. Вось тут і зьявіўся першы слоўнік, запісаны на звычайных картках. Наступным ужо быў раман А. Рыбакова «*Šverer zamd*» (у перакладзе на ідыш Тэўе Гена), які дазволіў стварыць дастаткова вялікі слоўнік і адначасова ўзбагаціў «рэстаўрацыйны» слоўны запас: «*farfaln*, *forlorn*, *farflojgn*» (*«зьнікла*, *згубілася*, *адляцела»*)... Ну а ўжо «брэжневізм» натхніў на стварэньне сваіх слоўнікаў і М. Залатуху й С. Верамейчыка. На гэтай урадлівай глебе нарадзіўся нават сапраўдны «брэжнеўскі рабочы жаргон»: «*arbetermišpoxe*», «*zavodišer hudok*», «*vaxte*», «*specovkes*», «*kartuz*», «*kepke*»…

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 18/11/2026 01:04:42

Паверце мне на слова, раман Мойшы Кульбака «*Zelmenjaner*», жанр якога быў акрэсьлены Алегам Хадыкам як «*fiš-bulbe*», на гады вызначыў жыцьцядзейнасьць і функцыянаваньне «Бастылії». Але гэты твор патрабуе асобнага расповеду…

Нашыя імёны таксама пераўтварыліся: Уладзімер Ракіцкі стаў *Ракіцэле*, Мікола Залатуха — *Эйбікам* ці *Штрайкопчыкам*, Іван Медзьвядзёў — *Янкелем*, Сяргей Дзенісенка — *Дэмблам*, Андрэй Дубінін — *Абрамам*… А я, Аляксандар Астравух, ператварыўся «афіцыйна» ў *Ойстраха*, а для блізкіх — проста ў *Осю*, *Ёсю*, *Шырэ*…

1984-ы — вялікі год у галіне ідышызацыі грамадзянаў Савецкага Саюзу: выйшаў у сьвет «Русско-еврейский (идиш) словарь» пад рэдакцыяй М. А. Шапіры, І. Р. Сьпівака й М. Я. Шульмана накладам у 20 000 асобнікаў. Пра доўгую й трагічную гісторыю стварэньня гэтае кнігі можна даведацца ў інтэрнэце з артыкулу Леаніда Флята «І слоўнік, і помнік».

Дзеля справядлівасьці трэба сказаць, што ў 1980-я гады ў кнігарнях ня толькі вялікіх гарадоў, але нават такіх, як Хіславічы, Амсьціслаў, Узда ці Пружаны, можна было знайсьці дзесьці ўбаку ад людзкіх вачэй, на верхняй паліцы колькі дзіўных кніжыцаў. Яны, зразумела, стаялі там дагары нагамі, бо мусілі чытацца ў адваротны бок, справа налева. Калі ж хтосьці адважваўся й усё ж браў іх у рукі, то пасьля першага спалоху ад незразумелага шрыфту раптам заўважаў ілюстрацыі, чамусьці перавернутыя дагары нагамі, — вельмі дзіўную чорна-белую графіку, падобную да дзіцячых «калякаў-малякаў»… Гэта былі кніжкі на ідышы!

«Hajnt iz a simxe, oj-oj-oj, a paxes…»
(«Сёньня сьвята, вой-вой-вой, шчасьце…)

Перабудова…

Час зьмяняўся з надзвычайнаю хуткасьцю. Міхаіл Гарбачоў зачараваў сьвет. У 1990-х гадох раптам нас, беларускіх рэстаўратараў, пачалі запрашаць для навучаньня й супрацоўніцтва ў эўрапейскія цэнтры рэстаўрацыі. Мы аказаліся па-сапраўднаму запатрабаваныя. Да таго абстрактныя словы «UNESCO», «ICOMOS», «ICCROM» раптам сталіся зразумелымі й блізкімі. Вы не паверыце, але з Эўропы мы везьлі слоўнікі, у тым ліку слоўнікі ідышу: «*Jidiš-engliš-hebreišer verterbux*» Аляксандра Гаркавага (нашага земляка з Наваградку), «*Modern engliš-jidiš un jidiš-engliš verterbux*» Урыэля Вайнрайха…

У 1989 годзе ў дадатку да «*Sovetiš Hejmland*» выйшаў двухтомнічак «*Kurcer jidiš-rusišer verterbux*» Г. Эйстраха. Сам жа часопіс пераўтварыўся ў «*Di jidiše gas*» («*Габрэйская вуліца*»), зьмяніў артаграфію, пачаў выдавацца на дзьвюх мовах: ідыш і па-расейску… Праўда, безь дзяржаўнага фінансаваньня праіснаваў яшчэ ўсяго некалькі гадоў…

У 1989 годзе, нарэшце, выйшаў у сьвет і падручнік ідышу Ш. Сандлера.

У гэтым жа годзе ў Менску удава рэпрэсаванага паэта-ідышыста Ізі Харыка Дзіна Звулаўна Харык, якая вярнулася з ГУЛАГу, арганізавала габрэйскую бібліятэку. Тая была названая, вядома ж, імем Ізі Харыка. У 1991 годзе гэта

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 18/11/2026 01:04:42

бібліятэка пераязджае на вуліцу з сымбалічным назовам Інтэрнацыянальная ў Менскае таварыства габрэйскае культуры (МТГК). Тут жа Гірш Рэлес і Аўром Жаніхоўскі арганізавалі курсы ідышу, а Мойша Сьвірноўскі стаў займацца габрэйскай музыкай і танцамі. І ў гэтых ужо далёка не маладых людзях пасьля дзесяцігодзьдзяў дзяржаўнага й пабытовага антысэмітызму раптам прачнуўся юнацкі запал, у іхных сэрцах, нарэшце, заквітнела «ружа любові» да ідышу — і гэтым асабістым шчасьцем яны гатовыя былі дзяліцца з усімі.

У 1996 годзе ў Кіеве выйшла ў сьвет кніга «*Kurcer jidiš-ukrainišer verterbux*» (аўтары І. Тарчынскі й З. Цішчанка).

А ў 1994–1998 гадох у Адэсе З. Цішчанка выдаваў часопіс на ідышы «Мамэлошн».

«Mir derjogn undzere jorn afn brejtn brik…»
(«Мы дагналі нашыя гады на шырокім мосьце…»)

Адначасова з адкрыцьцём «акна ў Эўропу» адчыніліся й дзьверы менскіх бібліятэкаў. Высьветлілася, што ў нашай «ленінцы» захаваліся й слоўнікі ідышу, выдадзеныя тут, у нас, у Менску: «*Яўрэйска-беларускі слоўнічак*» С. Плаўніка (Зьмітрака Бядулі) і Н. Рубінштэйна (1932) і дастаткова вялікі том «*Jidiš-rusišer verterbux*» З. Рохкінд і Г. Шкляра (1940). Але самым вялікім адкрыцьцём для мяне сталася аўтарка гэтага слоўніку Зоф'я (Шпрынца) Рохкінд. У 1998 годзе блізкі мне па ідышы і МТГК Вольф Рубінчык, у будучыні выдавец і рэдактар газэты «*Анахну кан*» і бюлетэню «*Mir zajnen nox do!*» («*Мы яшчэ тут!*»), што выходзілі ў 2002–2009 гадох, прывёў мяне да Шпрынцы дамоў (яна жыла ў Менску на вуліцы Чырвонай, 18). Ёй было ўжо 95 гадоў, і жыцьцё гэтага самотнага чалавека, які ўжо амаль нічога ня чуў і ня бачыў, падтрымліваў толькі «агмень ідышу». Яна перакладала А. Пушкіна й шораз, калі мы прыходзілі да яе, сустракала нас чытаньнем новага вершу! Паходзячы з Талачыну, Ш. Рохкінд праз усё сваё доўгае жыцьцё пранесла родны местачковы ідыш. Яна перадала мне сшытак з габрэйскімі прымаўкамі й прыказкамі, якія не ўвайшлі ў ейны слоўнік.

Аўром Жаніхоўскі памёр у 1999 годзе, Шпрынца Рохкінд — у 2000-м, Мойша Сьвірноўскі — у 2002-м, Гірш Рэлес — у 2004-м. *Zixrojnom levroxe! (Блаславёная памяць пра іх!)*

Але ў 2004 годзе сумесна зь Віленскім габрэйскім інстытутам мы пасьпелі яшчэ пры жыцьці Гірша Рэлеса падрыхтаваць да друку й выдаць на ідышы ягоную кнігу «*Di jidiš-sovetiše šrajber fun Vajsrusland*» («*Габрэйскія савецкія пісьменьнікі Беларусі*»). Гірш лічыў гэтую кнігу справаю свайго жыцьця, ён пісаў яе «ў стол» каля 20 гадоў. Большасьць літаратараў, пра якіх піша Г. Рэлес, былі рэпрэсаваныя ў сталінскі час, і памяць пра іх была амаль цалкам сьцёртая. Гіршу ўжо споўніўся 91 год, калі ён у Віленскім габрэйскім інстытуце на ідыш-сэмінары, на які штогод зьбіраецца каля 100 адмыслоўцаў з усяго сьвету, праводзіў прэзэнтацыю сваёй кнігі!

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 18/11/2026 01:04:42

Гэтая кніга сталася першым выданьнем, выпушчаным у Беларусі на ідышы — другой дзяржаўнай мове нашае краіны з 1920 па 1938 год, праз болей як 50 гадоў маўчаньня… Праўда, першая публікацыя на ідышы «*Jidiše šprixverter un glajxvertlex*», падрыхтаваная аўтарам гэтых радкоў, зьявілася нашмат раней, у 2000 годзе ў часопісе «ARCHE». Гэтую эстафэту падхапіў выдавец В. Рубінчык, рэгулярна друкуючы ў сваёй газэце «*Mir zajnen nox do!*» вершы, песьні, анэкдоты й прыказкі на ідышы. А ў 2008–2009 гадох ён жа выдаў сэрыю паэтычных кнігаў на ідышы: Ільля Злотнік, Ізі Харык, Эля Савікоўскі.

Росквіт ідыскае культуры на постсавецкай прасторы, як і ў папярэднія рэвалюцыйныя часы, быў нядоўгі. І неўзабаве ідыш зноў заняў сваё ціхае й спакойнае месца сярод ціхіх і спакойных інтэлігентных людзей.

«Jeder onhejb iz šver…»
(«Кожны пачатак цяжкі…»)

У лёсе майго «*Ідыш-беларускага слоўніка*» пераломным стаўся 1997 год.

У жніўні гэтага году габрэйскі пісьменьнік Гірш Рэлес прывёў да нас наўпрост на рэстаўрацыйны аб'ект, у Менскі Петрапаўлаўскі сабор, Довіда Каца, прафэсара Оксфардзкага ўнівэрсытэту, філёляга, гісторыка, этнографа й пісьменьніка, ідышыста плоць ад плоці! І, больш за тое, нашага земляка: ягоная сям'я вядзе свой род зь беларускіх мястэчкаў Міхалішкі, Сьвір, Сьвянцяны. Гэтая сустрэча перавярнула маё жыцьцё, як я некалі пераварочваў дагары нагамі тыя дзіўныя кніжкі зь незразумелым шрыфтам і падобнымі да дзіцячых ілюстрацыямі. З таго моманту падзеі майго жыцьця пішуцца й чытаюцца «ў адваротны бок» — справа налева.

1 верасьня 1997-га мой новы навучальны год пачаўся з напісаньня першых словаў для «*Ідыш-беларускага слоўніку*».

Летам 1998 году Довід Кац запрасіў групу рэстаўратараў з «Басталіі» ў Вільню на сэмінар па вывучэньні ідышу, які стаў штогадовым і заклаў падмурак для стварэньня празь некалькі гадоў Віленскага гэбрэйскага інстытуту. Гэты Інстытут працягнуў справу знакамітай даваеннай віленскай навуковай установы найвышэйшага кшталту YIVO.

Мой удзел у гэтым сэмінары (у 1999–2004 гадох) вызначыў лёс «*Ідыш-беларускага слоўніку*». Выдатныя пэдагогі, найшырэйшае кола ідышыстаў з розных краінаў, велізарная колькасьць мэтадычнае літаратуры ў межах сэмінару й у віленскіх бібліятэках і, нарэшце, асабістая зацікаўленасьць дырэктараў новага інстытуту Довіда Каца й Мэндзі Кагана — вось што, зразумела, зьявілася надзейным фундамэнтам стварэньня гэтага слоўніку, які праз 11 гадоў пасьля пачатку працы, у 2008 годзе, нарэшце пабачыў сьвет.

Pobrane z czasopisma Wschód Europy **http://journals.umcs.pl/we**
Data: 18/11/2026 01:04:42

«In a grojsn tajx xapt men grojse fiš…»
(«У вялікай рацэ лаві вялікую рыбу…»)

1 кастрычніка 2011 году я прыехаў у Амсьціслаў, дзе ня быў 27 гадоў…

…Замкавая гара, Траецкая гара, Дзявочая гара, Панівойская гара…

…рэчка Віхра…

Кармэліцкі касьцёл цяпер належыць каталіцкай парафіі, руіны Езуіцкага храму ў 1990-х гадох рэстаўратару Ю. Маліноўскаму нейкім цудам удалося накрыць…

Габрэйскія могілкі з прычыны адсутнасьці коз зарасьлі й ператварыліся ў бярозавы гай…

Помнік «забінтаванаму» піянэру зьнік з гарадзкога парку. Верагодна, зьнікненьне ягонае было прымеркаванае да сьвяткаваньня Дзён славянскага пісьменства: падрыхтоўка да гэтай падзеі, якая адбылася тут гадоў дзесяць таму, унесла істотныя зьмены ў мясцовы архітэктурна-гістарычны ансамбль. На плошчы паставілі помнік Пятру Мсьціслаўцу, але зьнішчылі старую сынагогу, дзе да перабудовы разьмяшчалася тая самая пажарная каманда, што ў 1980 годзе разам з рэстаўратарам У. Ракіцкім патушыла агонь, які ахапіў Езуіцкі касьцёл.

«Кагальны калодзеж» ператварыўся ў «помнік прыроды мясцовага значэньня» — таксама да тых жа дзён таго самага пісьменства…

Мясцовы інтэрнат для глухіх дзяцей дзейнічае дагэтуль, але пераехаў у іншае памяшканьне — былы дом сіротаў, у якім пяцьдзясят гадоў таму вучыўся будучы рэстаўратар Ю. Маліноўскі…

Ужо даўно няма ў жывых Рыўкі Міркінай і Аўрома Ліпкава (*zixrojnom levroxe!*), носьбітаў сапраўднага ідышу. Знаёмства зь імі сталася першым крокам на шляху «рэстаўрацыі ідышу па-беларуску»…

A ŠEJNEM DANK ALEMEN! ZAJT MIR GEZUNT, ŠTARK UN MACLIEX!

P. S. Калі некага зацікавіў гэты матэрыял, то падрабязнасьці можна прачытаць у прадмове, уступных артыкулах, пасьляслоўі й у самім тэксьце *«Ідыш-беларускага слоўніку»*.

(Пераклала з расейскай мовы Аля Сідарэвіч)